# СА СВЯТАМ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА!

**Няхай жыве Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя—галоўная падзея XX стагоддзя, пачатак сусветна-гістарычнага павароту чалавецтва ад капіталізму да сацыялізму!**

(З Заклікаў ЦК КПСС).


*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 32 (1219) ● 4 лістапада 1978 г. Цана 2 кап.




# 1917 - 1978

**Калектыў нашага універсітэта, як і ўвесь савецкі народ, сустракае 61-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка выдатнымі поспехамі.**

**Выконваючы Праграму партыі, рашэнні пленумаў ЦК КПСС, выкладчыкі многа зрабілі для павышэння ўзроўню лекцый і семінарскіх занясткаў, для стварэння студэнтам неабходных умоў для паспяховага авалодання ведамі. Па выніках 1977-78 навучальнага года якасная паспяховасць студэнтаў павысілася на 3,4 працэнта. Па-сапраўднаму масавай і дзейснай стала выхаваўчая работа партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый. Іх уплыў на ўсе бакі жыцця універсітэцкай сям'і расце з кожным днём.**

**Шырыцца гарызонт студэнцкай навукі. Універсітэт прымае самы актыўны ўдзел ва ўсесаюзных і рэспубліканскіх конкурсах. Так, 11 чалавек БДУ сталі лаўрэатамі V Усесаюзнага конкурсу работ маладых вучоных па грамадскіх навуках.**

**Далейшае развіццё атрымаў студэнцкі будаўнічы рух, які сёлета паклікаў 2 100 студэнтаў на новабудоўлі Беларусі, БАМа, Карэліі, Нечарназем'я, Кіргізіі, Малдавіі, Комі АССР на самыя адказныя ўчасткі, дзе патрэбны запал маладых.**

**Будатрадаўцамі універсітэта за лета асвоены 5,5 млн. рублёў капіталаўкладанняў. Такі канкрэтны ўклад студэнтаў БДУ ў выкананне рашэнняў XXV з'езда КПСС па далейшаму развіццю матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму.**

**Кожны факультэт, кожны курс можа пахваліцца сваімі добрымі справамі.**

**У святочнай калоне універсітэта ў адным страі на дэманстрацыю выйдуць прадстаўнікі многіх нацыянальнасцей нашай краіны, а таксама пасланцы В'етнама, Конга, Польшчы, Гвінеі, ГДР і іншых краін. Вялікі Кастрычнік запаліў для ўсіх народаў зорку міру і шчасця.**

**Са святам, дарагія таварышы!**

# ПЕРШАЯ ПАРТЫЙНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ БДУ

**27 кастрычніка ва універсітэце адбылася першая партыйная канферэнцыя. У рабоце яе ўдзельнічалі больш 500 дэлегатаў. Гэта партыйныя актывісты, пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Усе яны з вялікай заклапочанасцю абмяркоўвалі работу нашага шматтысячнага калектыву за апошнія тры гады, адзначалі недахопы, намячалі шляхі іх ліквідацыі.**

**У рабоце партыйнай канферэнцыі прынялі ўдзел: У. Д. Атрошчанка — загадчык аддзела навукі і вучэбных устаноў Мінскага абкома партыі; Р. П. Платонаў — сакратар Мінскага абкома партыі; Г. Г. Барташэвіч — першы сакратар Мінскага гаркома партыі; Б. А. Саўчанка — першы сакратар Маскоўскага райкома партыі; В. І. Стражаў — загадчык аддзела навукі і вучэбных устаноў Мінскага гаркома партыі; Ф. М. Капуцкі — першы намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і іншыя таварышы.**

**Партыйная канферэнцыя прыняла пастанову.**

**Са справаздачным дакладам на канферэнцыі выступіў сакратар партыйнага камітэта універсітэта М. С. Гарашчук. У спрэчках па дакладу выступілі: дэкан філалагічнага факультэта А. А. Волк, дырэктар выдавецтва БДУ В. С. Грыгор'еў, намеснік дырэктара НДІ ПФП А. С. Ключнікаў, дацэнт факультэта радыёфізікі і электронікі С. Р. Мулярчык, сакратар камітэта камсамола БДУ А. А. Тозік, рэктар універсітэта У. А. Белы, сакратар Мінскага абкома партыі Р. П. Платонаў і іншыя таварышы.**

**У гэтым нумары газеты мы друкуем вытрымкі з даклада сакратара парткома універсітэта М. С. Гарашчука і з выступленняў камуністаў.**



НА ЗДЫМКУ: у прэзідыуме канферэнцыі. Фота М. ДУБОВІКА.

# Усе намаганні — на выкананне планаў партыі

## (З ДАКЛАДА САКРАТАРА ПАРТЫЙНАГА КАМІТЭТА БДУ М. С. ГАРАШЧУКА)

ПЕРЫЯД, які мінуў пасля справаздачна - выбарнага партыйнага сходу універсітэта, знамянальны важнымі падзеямі ў жыцці нашай партыі і краіны, у жыцці БССР.

Усе нашы камуністы, студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі працавалі ў справаздачны перыяд пад знакам пераўтварэння ў жыццё рашэнняў XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда КПБ і патрабаванняў важнейшых партыйных і палітычных дакументаў, указанняў і рэкамендацый, якія змешчаны ў прамовах, выступленнях і кнігах тав. Л. І. Брэжнева «Малая Зямля», «Адраджэнне» і «Актуальныя пытанні ідэалагічнай работы КПСС».

Мінулыя тры гады з'явіліся важным этапам у дзейнасці парткома і партыйных арганізацый па далейшаму ўдасканаленню арганізатарскай і ідэалагічнай работы, усямернаму павышэнню эфектыўнасці вучэбнага працэсу, навуковай і выхаваўчай работы, развіццю творчай ініцыятывы студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

Вялікую ўвагу ў справаздачны перыяд партком і партыйныя арганізацыі ўдзялялі ліквідацыі недахопаў, выказаных у адрас нашага універсітэта на XXVIII з'ездзе КПБ.

Крытыка ў адрас універсітэта была ўспрынята камуністамі, усімі членамі нашага калектыву па-партыйнаму, з глыбокім разуменнем і пачуццём высокай адказнасці за стан спраў.

Характэрнай рысай справаздачнага перыяду было далейшае разгортванне сацыялістычнага спаборніцтва ў калектывах універсітэта.

У 1976 годзе універсітэт заняў першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве сярод універсітэтаў краіны і быў узнагароджан пераходным Чырвоным Сцягам ЦК КПСС, СМ СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ, у 1977 годзе — другое месца. Такая высокая ацэнка работы калектыву універсітэта нас не толькі радуе, але і да многага абавязвае.

Асноўным нашым укладам у справу рэалізацыі планаў партыі за далейшы навукова-тэхнічны прагрэс з'яўляецца падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў, усебакова развітых і падрыхтаваных людзей.

Партком, рэктарат, партыйныя арганізацыі, дэканаты і кафедры пастаянна ўдзялялі ўвагу павышэнню эфектыўнасці і якасці навучальнага працэсу. Укараняліся перадавыя метады і формы навучання з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў, метадаў праграміраванага навучання.

Важным сродкам павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з'яўляецца вучэбна-метадычная работа. Ва універсітэце яна добра наладжана. Распрацаваны рэкамендацыі і па ўдасканаленню навучальнага працэсу і самастойнай работы студэнтаў. Выкладчыкі універсітэта ў 1976—1978 гадах прынялі ўдзел у 23 навукова-метадычных семінарах і нарадах, якія праводзіліся Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і БССР, у тым ліку 11 з іх былі арганізаваны на базе нашага універсітэта.

Прафесарска - выкладчыцкім саставам у 1976—1978 гадах выдадзена 146 падручнікаў і манаграфій, апублікавана 257 навучальных і метадычных дапаможнікаў.

Вялікая работа па паляпшэнню навучальнага працэсу праводзіцца на факультэтах. У апошнія гады паспяховасць студэнтаў стабілізавалася і састаўляе 93,5 (85,3 вяч.) працэнта. Мы лічым, што гэта ў цэлым не нізкі працэнт.

Аднак нас хвалюе той факт, што не назіраецца тэндэнцыя да павелічэння працэнта студэнтаў, якія займаюцца на «добра» і «выдатна».

На ўсесаюзным злёце студэнтаў Генеральны сакратар ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнеў гаварыў: «Савецкі спецыяліст сёння — гэта чалавек, які добра авалодаў асновамі марксісцка-ленінскага вучэння, ясна бачыць палітычныя мэты партыі і краіны, мае шырокую навуковую і практычную падрыхтоўку, у дасканаласці валодае сваёй спецыяльнасцю. Савецкі спецыяліст сёння — гэта ўмелы арганізатар, здольны на практыцы прымяніць прынцыпы навуковай арганізацыі працы. І, канешне, сучасны спецыяліст — гэта чалавек высокай культуры, шырокай эрудыцыі».

Кіруючыся гэтымі ўказаннямі, партком, рэктарат, дэканаты і партыйныя бюро факультэтаў пастаянна клапоцяцца аб павышэнні якасці выкладання грамадскіх дысцыплін. З канкрэтных мерапрыемстваў у гэтым напрамку трэба адзначыць перыядычнае абмеркаванне на сумесных пасяджэннях партыйна-камсамольскага актыву факультэтаў і кафедр грамадскіх навук пытанняў выкладання і вывучэння студэнтамі сацыяльна-эканамічных дысцыплін. Такія абмеркаванні прыносяць карысць як у паляпшэнні выкладання грамадскіх дысцыплін, так і ў навучанні і выхаванні студэнтаў.


У зале канферэнцыі.

ПАЛЯПШАЮЧЫ спецыяльную падрыхтоўку студэнтаў універсітэта, мы ў апошнія гады прыкметна ўзмацнілі ўвагу на ідэйную накіраванасць вучэбнага працэсу. Так, у мінулым навучальным годзе на пасяджэннях партыйных бюро і кафедр фізічнага, біялагічнага, юрыдычнага, механіка-матэматычнага і іншых факультэтаў абмяркоўвалася пытанне аб ідэйнай накіраванасці навучальнага працэсу. Абмяркоўвалася яно і на пасяджэнні парткома. У гэтай справе ўжо назапашан вялікі вопыт на фізічным, біялагічным і іншых факультэтах.

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя патрабуе адзінства і строгай абумоўленасці эканамічнага, сацыяльнага і культурнага прагрэсу. У новых умовах змяняецца сам падыход да пастаноўкі задач аб узаемных сувязях грамадскіх, гуманітарных і прыродазнаўчых навук, у падрыхтоўцы спецыялістаў для народнай гаспадаркі, навукі і культуры.

Задача заключаецца ў тым, гаварыў тав. П. М. Машэраў на XXVIII з'ездзе КПБ, каб «...як лепш і эфектыўней узбагаціць планы падрыхтоўкі спецыялістаў на прыродазнаўчых і тэхнічных факультэтах прадметамі гуманітарнага цыклу, а на гуманітарных факультэтах — матэматычнымі метадамі пазнання».

У плане выканання рэкамендацый XXVIII з'езда КПБ у мінулым навучальным годзе партыйны камітэт займаўся пытаннем узаемаўзбагачэння гуманітарных і прыродазнаўчых навук. На пасяджэнні парткома разглядаліся шляхі вырашэння гэтай цікавай і важнай праблемы.

Нягледзячы на прыкметныя поспехі ў арганізацыі навучальнага працэсу, у нас ёсць і нявырашаныя праблемы, цяжкасці і, на наш погляд, недагляды ў падрыхтоўцы кваліфікаваных маладых спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй. Мы многае робім у плане адаптацыі ўчарашніх школьнікаў, выхавання ў іх любві да будучай прафесіі. Гэтаму садзейнічае і курс «Уводзіны ў спецыяльнасць».

Пры аналізе якасці падрыхтоўкі нашых выпускнікоў на некаторых факультэтах выяўляецца, што няма прыкметнага росту паспяховасці ад курса да курса. Бываюць выпадкі, калі колькасць выдатнікаў на старэйшым курсе памяншаецца.

Неабходна больш увагі надаваць студэнтам-выдатнікам і студэнтам, якія маюць у цэлым і невысокія адзнакі, але могуць і жадаюць добра вучыцца. З імі трэба больш працаваць індывідуальна.

Асноўныя свае намаганні мы накіроўваем на павышэнне абсалютнага працэнта паспяховасці, на работу з адстаючымі, а то і проста на тых, хто не жадае вучыцца. Ці апраўдана гэта?

Якасць падрыхтоўкі спецыялістаў у ВНУ самым непасрэдным чынам залежыць ад таго, ці выпрацоўваюцца ў студэнтаў творчае мысленне, навыкі даследчай дзейнасці.

Прыцягненне студэнтаў да навукова-даследчай работы, стварэнне ўмоў для самаадукацыі — важны шлях фарміравання ўсебакова развітой асобы. У гэтым напрамку наш калектыў у апошнія гады дабіўся прыкметных поспехаў. У цэлым па універсітэту ў мінулым годзе прымалі ўдзел у даследаваннях па тэмах НДР кафедр як па дзяржбюджэту, так і па гасдагаворах каля 76 працэнтаў усіх студэнтаў. Аднак гэтыя паказчыкі характарызуюць толькі шырыню ахопу студэнтаў навукова-даследчай работай. Больш дакладны аналіз паказвае, што ў нас аслаблена ўвага да паглыблення падрыхтоўкі студэнтаў да навукова-даследчай дзейнасці. Аб гэтым сведчыць той факт, што на працягу шэрагу гадоў універсітэт са значнымі цяжкасцямі камплектуе вочную аспірантуру з ліку выпускнікоў.

Узровень падрыхтоўкі студэнтаў гэта не толькі іх асабістыя поспехі, але і вынік педагагічнай работы ўсяго нашага калектыву.

Наогул, ва універсітэце сталы, кваліфікаваны састаў выкладчыкаў, які спалучае вопыт і розум старэйшага пакалення педагогаў з энергіяй і творчым пошукам моладзі.

Разам з тым востра стаіць пытанне з кадрамі, якія маюць вучоныя ступені і званні, і асабліва з падрыхтоўкай дактароў навук.

ВУЧОБА ва універсітэце сёння — гэта выключна вялікая праца, якая патрабуе ад студэнта сістэмы, самадысцыпліны і часу. Таму пры планаванні ўсіх іншых відаў работ і правядзенні мерапрыемстваў у ВНУ неабходна ўлічваць, што вучоба для студэнта — яго асноўная справа.

Партком, рэктарат, пярвічныя партыйныя арганізацыі шмат увагі надавалі пытанням навуковай работы, павышэнню тэарэтычнага ўзроўню і эфектыўнасці навуковых даследаванняў, паскарэнню ўкаранення вынікаў НДР у народную гаспадарку і вучэбна-выхаваўчы працэс. Гэтыя пытанні неаднаразова абмяркоўваліся на пасяджэннях парткома і на партыйных сходах.

Адметнай асаблівасцю справаздачнага перыяду была далейшая перабудова тэматыкі навуковых даследаванняў на аснове рашэнняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ і канцэнтрацыя сіл навуковага і навукова-выкладчыцкага саставу універсітэта на важнейшых напрамках фундаментальных і прыкладных даследаванняў. Асаблівая ўвага была звернута на арганізацыю калектыўных і комплексных НДР, выключэнне з планаў малаперспектыўных і дробных тэм.

Атрымала далейшае развіццё навуковая сувязь з АН СССР і АН БССР. Па каардынацыйных планах навуковых Саветаў АН БССР у 1978 годзе выконвалася 70 тэм (у 1975 годзе — 48). У план важнейшых НДР па Беларускай ССР і Савета па каардынацыі навуковай дзейнасці АН БССР увайшло 120 тэм (у 1975 годзе — 75), у тым ліку 33 тэмы ўвайшлі ў праграмы работ па рашэнню важнейшых рэспубліканскіх комплексных праблем.

Універсітэт пастаянна развівае сувязі з прадпрыемствамі і арганізацыямі на базе дагавораў аб навуковым супрацоўніцтве і гаспадарчых дагавораў. Так, аб'ём гасдагаворных работ у 1978 годзе складае 6 млн. 693 тыс. рублёў (у 1975 годзе — 4 млн. 164 тыс. рублёў).

Адной з дасканалых форм сувязі навукі ВНУ з вытворчасцю з'яўляюцца вучэбна-навукова - вытворчыя аб'яднанні. З 1975 года функцыяніруе аб'яднанне БДУ — ВТА «Інтэграл».

Эканамічны эфект ад укаранення вынікаў НДР, выкананых вучонымі універсітэта для ВТА «Інтэграл», склаў у 1977 годзе каля 500 тыс. рублёў.

Значныя даследаванні праводзяцца па грамадскіх навуках. Так, у 1978 годзе па раздзелах грамадскіх навук выконваецца 79 тэм, у тым ліку 26 па заданнях ЦК КПБ. Праблемная лабараторыя сацыялагічных даследаванняў з'яўляецца галаўной арганізацыяй па выкананню работ рэспубліканскай комплекснай сацыяльна - эканамічнай праблемы «Сацыялогія працы, змена яе характару і зместу ў перыяд развітога сацыялізму». За 1976—1977 гады выдадзена па грамадскіх навуках 30 манаграфій, вучэбных дапаможнікаў, падручнікаў, 10 зборнікаў навуковых прац.

Наогул, універсітэт мае значныя поспехі ў навуковай рабоце. Разам з тым, пры дэтальным аналізе арганізацыі навуковых даследаванняў, іх эфектыўнасці выкарыстаны далёка не ўсе магчымасці. Важнай задачай універсітэцкай навукі з'яўляецца развіццё фундаментальных даследаванняў. Адным з паказчыкаў узроўню фундаментальных даследаванняў з'яўляецца выданне манаграфій, падручнікаў і навучальных дапаможнікаў. На жаль, колькасць манаграфій і распрацовак, якія выкананы нашымі вучонымі, невялікая.

За справаздачны перыяд павялічылася колькасць распрацовак. Так, калі ў 1975 годзе было пададзена 126 аўтарскіх заяў, то ў 1977 годзе — 177. У 1975 годзе было атрымана 37 станоўчых рашэнняў Дзяржкамітэта па справах вынаходстваў і адкрыццяў пры СМ СССР у 1977—82.

Як бачна, заяў шмат, а ўкараняюцца ў вытворчасць толькі асобныя нашы дасягненні, якія выкананы на ўзроўні вынаходстваў.

НАМАГАННІ партыйнай арганізацыі павінны быць накіраваны на далейшае павышэнне эфектыўнасці і якасці навуковых даследаванняў, на рэалізацыю новай вельмі важнай пастановы ЦК КПСС і СМ СССР «Аб мерах па павышэнню эфектыўнасці навукова-даследчай работы ў вышэйшых навучальных установах», якая вызначае задачы і шляхі далейшага развіцця навукі ВНУ.

Кіруючыся рашэннямі XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ, партком, партыйныя арганізацыі ў справаздачны перыяд больш увагі надавалі пытанням удасканалення ідэйна-выхаваўчай работы. Адной з цэнтральных яе задач з'яўлялася фарміраванне і паглыбленне камуністычнага светапогляду ўсіх членаў калектыву.

Гэты навучальны год у сістэме партыйнай вучобы пачаўся з вывучэння матэрыялаў ліпеньскага (1978 года) Пленума ЦК КПСС і кнігі тав. Л. І. Брэжнева «Актуальныя пытанні ідэалагічнай работы КПСС».

У параўнанні з 1975 годам колькасць слухачоў у сістэме партыйнай вучобы ўзрасла прыкладна на 700 чалавек. Пашырылася сетка семінараў вышэйшага звяна (у 1975—38, у 1978 — 77 семінараў).

Асаблівасцю партыйнай вучобы апошніх гадоў з'яўляецца ўзросшая цікавасць выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта да праблем метадалогіі грамадскіх і прыродазнаўчых навук.

Асабліва вялікі клопат аб павышэнні ідэйна - тэарэтычнага ўзроўню выкладчыкаў і супрацоўнікаў праявіла партыйная арганізацыя фізічнага факультэта (адказны за партвучобу тав. Рагоўскі І. Т.).

Фізфак быў таксама ініцыятарам правядзення вынікавых тэарэтычных канферэнцый, семінараў вышэйшага звяна. Яны выклікаюць вялікую цікавасць

# Усе намаганні — на выкананне планаў партыі

выкладчыкаў факультэта і праходзяць на высокім тэарэтычным узроўні. Канферэнцыі праводзіліся таксама на юрыдычным і хімічным факультэтах. У далейшым правядзенне выніковых канферэнцый павінна стаць абавязковым для ўсіх партыйных арганізацый.

Галоўным участкам партыйнага кіраўніцтва палітычнай адукацыяй з'яўляецца работа па падбору і падрыхтоўцы прапагандысцкіх кадраў. Прапагандысцкую работу ў нас вядуць 248 камуністаў, каля 70 працэнтаў з іх маюць стаж прапагандысцкай работы больш за 10 год. Доўгія гады паспяхова кіруюць тэарэтычнымі семінарамі ў сістэме партыйнай адукацыі універсітэта камуністы: В. І. Сцяпанаў, В. А. Навіцкі, А. І. Ляўко, А. В. Дулаў, Я. В. Петушкова, А. Я. Супрун і іншыя.

Разам з тым у арганізацыі партыйнай вучобы ёсць і недахопы. Бываюць яшчэ выпадкі зрываў і пераносаў заняткаў. Часам у тэарэтычных семінарах наглядаецца недастатковая актыўнасць слухачоў, мала праводзіцца дыскусій, канферэнцый, не заўсёды ўлічваецца высокі ўзровень падрыхтоўкі нашых выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

Важным фактарам фарміравання навуковага светапогляду, актыўнай жыццёвай пазіцыі, высокіх ідэйна-палітычных і маральных якасцей савецкіх людзей з'яўляецца лекцыйная прапаганда. Яна праводзіцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі XXV з'езда партыі і Пастановы ЦК КПСС «Аб стане і мерах паляпшэння лекцыйнай прапаганды».

ВЫКЛАДЧЫКІ і супрацоўнікі універсітэта ўносяць вялікі ўклад у распаўсюджанне палітычных і навуковых ведаў. Толькі за апошнія тры гады па пуцёўках таварыства «Веды» прачытана больш як 18 тысяч лекцый, з іх 60 працэнтаў — па грамадска-палітычнай тэматыцы. А за 9 месяцаў гэтага года па матэрыялах 60-годдзя Вялікага Кастрычніка, Канстытуцый СССР і БССР, 60-годдзя БССР і КПБ прачытана каля 4 тысяч лекцый і праведзена 15 навукова-практычных канферэнцый у падшэфных раёнах.

Цяпер выкладчыкі і студэнты універсітэта прымаюць актыўны ўдзел у прапагандзе асноўных палажэнняў кнігі Генеральнага сакратара ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнева «Актуальныя пытанні ідэалагічнай работы КПСС».

Пры БДУ працуе шэсць народных універсітэтаў, у тым ліку адзіны ў краіне універсітэт — «Метады прыкладной матэматыкі ў кіраванні вытворчасцю і ў навуковых даследаваннях» на базе факультэта прыкладной матэматыкі. Ён узнагароджан дыпломам II ступені ВДНГ. Плённа працуюць народныя універсітэты «Прававых ведаў», «Навукова-педагагічных ведаў» і іншыя.

Лепшымі лектарамі універсітэта з'яўляюцца камуністы В. І. Сцяпанаў, Г. П. Давідзюк, А. А. Галаўко, Я. М. Тагуноў, Ю. А. Гусеў, Р. І. Вадэйка, М. Я. Зайцаў, І. Ф. Рэкуц, І. Д. Стадуб і іншыя.

Важная заслуга ў арганізацыі лекцыйнай прапаганды ва універсітэце належыць старшыні праўлення таварыства «Веды» дацэнту М. Я. Рэзнікаву.

Вялікую дапамогу універсітэту аказвае ІПК пры БДУ, вельмі кваліфікаваны калектыў якога актыўна ўключыўся ў лекцыйную прапаганду.

Вызначаючы праблемы камуністычнага выхавання на сучасным этапе развіцця савецкага грамадства, XXV з'езд КПСС вылучыў і абгрунтаваў ідэю комплекснага падыходу да пастаноўкі ўсёй справы выхавання. Рэалізуючы рашэнні XXV з'езда КПСС, рэктаратам і парткомам распрацавана, абмеркавана ў калектыве і прынята ў лістападзе 1976 года «Комплексная праграма ідэйна-выхаваўчай работы са студэнтамі на ўвесь перыяд навучання ва універсітэце». У праграме па ўсіх трох напрамках (ідэйна-палітычнага, маральнага і працоўнага) выхавання вызначаны задачы і асноўныя мерапрыемствы як у вучэбным працэсе, так і ў пазавучэбны час з улікам кожнага курса асобна.

У ідэйна-палітычным выхаванні асабліва дакладна праграма вызначае задачы кафедр грамадскіх навук.

Вялікае значэнне надаецца і маральнаму выхаванню. Пры парткоме створана спецыяльная камісія, якая распрацавала праект сістэмы маральна-эстэтычнага выхавання.

Працоўнае выхаванне — гэта вучоба, навукова-даследчая работа, а таксама ўдзел у будаўнічых студэнцкіх атрадах, якія сталі важнай школай сацыяльнай загартоўкі студэнцтва.

Прыемна адзначыць, што ва універсітэце нарадзілася ў гэтым годзе новая форма студэнцкага будаўнічага руху — камуністычны атрад. На працягу трох месяцаў гэты атрад бясплатна працаваў на будаўніцтве мемарыяльнага комплексу Герою Савецкага Саюза Аляксандру Матросаву на месцы яго гераічнага подзвігу (в. Чарнушкі, Пскоўскай вобласці).

Усё больш узрастае ў сучасных умовах роля маральна-эстэтычнага выхавання. Важнасць гэтага аспекту камуністычнага выхавання з асаблівай сілай падкрэслена ў дакументах XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда КПБ, у Канстытуцыях СССР і БССР, у матэрыялах V і VII (1977 г.) Пленумаў ЦК КПБ.

Партком і рэктарат, пачынаючы з 1975 года, удзяляюць пільную ўвагу гэтаму аспекту камуністычнага выхавання. Пры парткоме створана спецыяльная камісія, якая распрацавала праект сістэмы маральна-эстэтычнага выхавання ў Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна.

У 1977 годзе камісіяй парткома, кафедрай марксісцка-ленінскай этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму, камітэтам камсамола падрыхтавана і праведзена навукова-практычная канферэнцыя камсамольскага актыву універсітэта, прысвечаная праблемам рэалізацыі палажэнняў сістэмы маральна-эстэтычнага выхавання.

Аднак у рабоце па маральна-эстэтычнаму выхаванню ёсць і недахопы. Думаецца, што камісіі пры парткоме, побач з выпрацоўкай рэкамендацый і тэарэтычных палажэнняў, належыць больш займацца абагульненнем і ўкараненнем у практыку перадавога вопыту. Яшчэ не на ўсіх факультэтах рэалізуюцца рэкамендацыі сістэмы маральна-эстэтычнага выхавання ва універсітэце. Слаба падключаюцца да работы па маральна-эстэтычнаму выхаванню прафсаюзныя арганізацыі. Не ў поўную меру ўключыліся ў гэтую справу савет куратараў, студсаветы інтэрнатаў, многія кафедры спецыяльных дысцыплін.

ВАЖНАЯ роля ў камуністычным выхаванні студэнтаў належыць мастацкай творчасці. Белдзяржуніверсітэт — адзіная вышэйшая навучальная ўстанова ў рэспубліцы, якая мае 4 народныя калектывы мастацкай самадзейнасці.

Адзначаючы прыкметныя поспехі нашай мастацкай самадзейнасці, трэба наперад паклапаціцца аб тым, каб работа яе калектываў вызначалася глыбінёй зместу, разнастайнасцю форм і выканаўчым майстэрствам.

Важнае значэнне надавалася ў справаздачным перыядзе інтэрнацыянальнаму выхаванню. Арганізоўваліся вечары дружбы, прысвечаныя знамянальным датам народаў СССР і замежных краін, праводзіліся мітынгі салідарнасці ў падтрымку народаў, якія змагаюцца супраць каланіялізму, рэакцыі і імперыялізму, сумесныя вечары адпачынку савецкіх і замежных студэнтаў. Прыкметную работу ў гэтым напрамку праводзілі філалагічны, гістарычны, геаграфічны і іншыя факультэты.

Ва ўсёй шматграннай выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў вялікае значэнне належыць куратарам — настаўнікам моладзі. У БДУ склаліся новыя формы арганізацыйна-метадычнай работы з куратарамі. Гэта саветы куратараў факультэтаў і савет куратараў універсітэта. Актыўна працавалі саветы куратараў на біялагічным, хімічным, гістарычным, фізічным, філалагічным, механіка-матэматычным і геаграфічным факультэтах. Неабходна ўзмацніць работу ў гэтым напрамку факультэтам радыёфізікі і электронікі і прыкладной матэматыкі.

У справаздачны перыяд партком прымаў меры па павышэнню ўзроўню арганізацыйна-партыйнай работы, паляпшэнню кіраўніцтва дзейнасцю партарганізацый.

Важным сродкам барацьбы з недахопамі, паляпшэння якасці работы ўсіх звенняў універсітэта, паляпшэння абставін у калектывах з'яўляецца крытыка і самакрытыка. У снежні 1976 года было праведзена сумеснае пасяджэнне парткома, рэктарата і савета універсітэта, на якім разглядалася пытанне «Аб узмацненні ролі і дзейнасці крытыкі і самакрытыкі ў паляпшэнні якасці і эфектыўнасці работы партыйных арганізацый, дэканатаў, аддзелаў і служб па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў». На пасяджэнні крытыкаваліся многія калектывы, у якіх мелі месца нездаровыя адносіны паміж супрацоўнікамі, недахопы ў рабоце. Але гэты добры пачатак у развіцці крытыкі і самакрытыкі не атрымаў шырокага развіцця. Асобныя таварышы, у тым ліку і камуністы, яшчэ нярэдка ўспрымаюць крытыку няправільна. Часам крытыка не мае канкрэтнага адраса, робіцца з аглядкай. Відаць, у нашым калектыве няма яшчэ тых абставін, калі кожны камуніст змог бы смела паставіць узнікшае пытанне.

Адным з важных шляхоў ліквідацыі недахопаў, выказаных у адрас універсітэта на XXVIII з'ездзе КПБ, з'яўляецца паляпшэнне работы з кадрамі. Пытанні падбору, расстаноўкі і выхавання кадраў рэгулярна абмяркоўваюцца на пасяджэннях парткома і партыйнага бюро.

Нельга сказаць, аднак, што ўсе пытанні, звязаныя з падборам, расстаноўкай і выхаваннем кадраў, вырашаюцца паспяхова. Упершыню неабходна адзначыць, што ў рабоце з кадрамі пакуль што няма сістэмы, не створаны рэзерв кіраўнікоў падраздзяленняў, аддзелаў і служб. Не вызначаны меры па выхаванню кіруючых кадраў. Таму асобныя кіраўнікі не апраўдваюць аказанага ім давер'я, дапускаюць сур'ёзныя недахопы ў рабоце.

Наш калектыў дасягнуў высокіх паказчыкаў у рабоце, аднак сёння нам трэба сканцэнтраваць сваю ўвагу на недахопах і нядбайнасцях, на нявырашаных задачах з тым, каб дабіцца яшчэ больш поспехаў. На гэта павінна быць накіравана ўся арганізатарская і выхаваўчая работа камуністаў, усіх членаў калектыву.



Ідзе рэгістрацыя дэлегатаў.

# Глядзець у будучыню

У. А. БЕЛЫ,
рэктар універсітэта

НАПЯРЭДАДНІ слаўнага юбілею—60-годдзя БССР і КПБ усяму калектыву універсітэта і асабліва яго партыйнай арганізацыі прадстаіць многа папрацаваць. Новаму саставу парткома прыйдзецца завяршыць выкананне ўсіх планаў і мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да юбілею, сканцэнтраваць увагу на выкананні рашэнняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ.

Хутка універсітэт адзначыць сваё 60-годдзе. Ідучы насустрач гэтай знамянальнай падзеі, нам трэба яшчэ больш пільна прыглядзецца да сваёй работы, крытычна і прынцыпова прааналізаваць недахопы, якіх у нас яшчэ шмат.

У справаздачным дакладзе былі закрануты ўсе пытанні жыцця нашага калектыву, акрэслены нашы дасягненні. А яны не малыя. У апошнія гады універсітэт змог значна павысіць агульную паспяховасць студэнтаў. Яна складае зараз 94,4 працэнта. Развіваецца матэрыяльна-тэхнічная база нашай ВНУ. Але ўсё ж яна не адказвае патрабаванням сённяшняга дня. Неабходна яшчэ больш інтэнсіўна весці капітальнае будаўніцтва, пашыраць вучэбныя плошчы, аснашчаць лабараторыі універсітэта навейшым абсталяваннем.

Як вядома, ёсць рашэнне вынесці універсітэт у раён вёскі Шчомыслiцы. Але ці мэтазгодна выносіць цэнтр навукі і культуры на ўскраіну горада? Гэтае пытанне, на нашу думку, з'яўляецца складаным. Належыць яшчэ і яшчэ раз абмеркаваць з нашымі градабудаўнікамі гэтую праблему і прыняць канчатковае рашэнне аб далейшым развіцці універсітэта.

Універсітэты заўсёды былі, ёсць і будуць калыскай фундаментальных даследаванняў. У поўнай меры гэта датычыцца і нашай ВНУ. Асабліва добрых паказчыкаў дасягнулі ў навукова-даследчай работе прыродазнаўчыя факультэты. Вялікая адказнасць у гэтым напрамку ляжыць на гуманітарных факультэтах (філалагічным, гістарычным). Калі мы адстанем у галіне гуманітарных навук, многія помнікі старажытнасці назаўсёды перастануць існаваць. Гэтага нам не даруюць. Тут вельмі важна памятаць аб маральным баку справы.

Мы дасягнулі высокага ўзроўню ў падрыхтоўцы прафесарска-выкладчыцкага саставу. У нас няма патрэбы прыцягваць да работы спецыялістаў з іншых ВНУ. Наадварот, мы павінны дапамагаць у гэтым плане многім навучальным установам. Але з асаблівай вастрынёй паўстала цяпер пытанне паляпшэння жыллёва-бытавых умоў супрацоўнікаў універсітэта. Вельмі марудна вядзецца асваенне капіталаўкладанняў, выдзеленых на будаўніцтва жылога дома. На сённяшні дзень план будаўніцтва жылога дома выканан толькі на 10 працэнтаў, а навучальнага корпуса ў Шчомыслiцах—толькі на 31 працэнт. У гэтым ёсць віна рэктарата і партарганізацыі. Але мы думаем, што існуючыя штабы па будаўніцтву ўсіх узроўняў таксама павінны былі звярнуць увагу на правал усіх будоўляў БДУ і выправіць становішча, якое склалася, аднак гэтага да сённяшняга дня не зроблена.

Востра стаіць і пытанне забеспячэння студэнтаў інтэрнатамі. У цяперашні час мы забяспечваем месцамі ў інтэрнатах каля 60 працэнтаў студэнтаў. У многіх навучальных установах краіны гэты паказчык значна вышэйшы.

Неабходна сказаць і пра ўзровень арганізацыйнай работы, таму што ад яе многае залежыць, напрыклад, мікраклімат у калектыве. На мой погляд, памылка партыйнага кіраўніцтва — у недастатковай сувязі яго з калектывам. Кіраўніцтву універсітэта неабходна часцей бываць на факультэтах, кафедрах, у лабараторыях і падраздзяленнях, унікаць у іх работу, цікавіцца іх запытаннямі, усяляк дапамагаць.

У нас існуе шмат цудоўных традыцыйных свят, у тым ліку і пачатак новага навучальнага года. У гэты дзень выпускнікі школ сустракаюцца з першакласнікамі, у вышэйшых навучальных установах праходзіць пасвячэнне першакурснікаў у студэнты. Будаўнікі ўручаюць калектывам ключы ад новых школ, ВНУ і тэхнікумаў.

Нам трэба пачынаць кожны навучальны год сходам усяго калектыву ў Палацы спорту або Оперным тэатры. На гэтым сходзе павінен выступіць рэктар і расказаць калектыву універсітэта аб прайшоўшым навучальным годзе, паставіць задачы на новы навучальны год. На гэтым жа сходзе неабходна падвесці вынікі сацыялістычнага спаборніцтва, агляду-конкурсаў і г. д.

Перад удзельнікамі сходу павінны выступіць лепшыя самадзейныя калектывы і прафесіянальныя артысты.

Перад намі стаіць шмат складаных пытанняў. І вырашыць іх мы зможам толькі агульнымі намаганнямі, агульнай зацікаўленасцю ў выніках работы.

# З выступленняў камуністаў

## А. А. ТОЗІК,
**сакратар камітэта камсамола універсітэта**

У МІНУЛЫЯ пасля справаздачна-выбарнага партыйнага сходу тры гады мы правялі абмен камсамольскіх дакументаў. Зроблен значны крок наперад у арганізацыі грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў. З'явіліся і заваявалі трывалыя пазіцыі новыя цікавыя традыцыі: масавыя студэнцкія злёты, паходы выхаднога дня, свята факультэтаў (дні фізікаў, хімікаў, матэматыкаў). У пачатку гэтага навучальнага года ўпершыню было праведзена свята пасвячэння ў студэнты першакурснікаў.

Камсамол прымае актыўны ўдзел у арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, восеньскіх сельскагаспадарчых работ.

Устанавіліся добрыя кантакты камітэтаў камсамола з кафедрамі грамадскіх навук. Так, пры камітэце камсамола БДУ і кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў створана і паспяхова працуе студэнцкая сацыялагічная лабараторыя.

Вызначэнне паняцця «сучасны спецыяліст» дакладна і глыбока дано ў выступленні тав. Л. І. Брэжнева на Усесаюзным злёце студэнтаў. Такіх спецыялістаў выклікан рыхтаваць і наш універсітэт. Ці ўсё мы робім для гэтага? Не, не ўсё. Нявыкарыстанымі застаюцца значныя рэзервы. Сёння паспяховасць студэнтаў на універсітэце складае 93—94 працэнты. Ці трэба нам асноўныя сілы накіроўваць на павялічэнне гэтага працэнта? Мэтазгодней звярнуць увагу на якасны бок паспяховасці. 3—3,5 тысяч студэнтаў з сесіі ў сесію атрымліваюць здавальняючыя адзнакі. Гэта вельмі многа. А, як правіла, да нас прыходзяць людзі, якія ў школе займаліся на «добра» і «выдатна». Такое становішча склалася, на наш погляд, таму, што нягледзячы на нашы шматлікія размовы, мы не займаемся глыбока працэсам адаптацыі студэнта ва універсітэце.

Па даным нашай сацыялагічнай лабараторыі большасць студэнтаў адзначаюць у якасці галоўнай цяжкасці, а, такім чынам, і галоўнай праблемы адаптацыі, самастойнае, без знешняга кантролю размеркаванне часу (28,8 працэнтаў) і вялікі аб'ём самастойных заняткаў (20,8 працэнтаў).

Даследаванне паказвае, што першакурснікі не заўсёды паспяхова авалодваюць ведамі, таму што ў іх не сфарміраваліся такія рысы асобы, як гатоўнасць да навучання, здольнасць вучыцца самастойна, кантраляваць і ацэньваць сябе, умець правільна размяркоўваць вольны час і г. д. Каб сфарміраваць гэтыя рысы, нам неабходна ўжо ў першыя тыдні знаходжання студэнта ў ВНУ удзяліць яму самую сур'ёзную ўвагу. Мэтазгодна, на наш погляд, распрацаваць комплекс метадычных указанняў па рабоце з першакурснікамі, увесці спецыяльны факультатыў «Арганізацыя самастойнай работы студэнта». Адмоўна ўплывае на працэс гарманічнага ўключэння першакурсніка ў сістэму ВНУ яго практычна палутарамесячны ўдзел у сельгасработах. Гэта патрэбна рабіць, але ў адносінах да першага курса — не больш двух тыдняў.

Аднак паляпшэнне работы з першакурснікамі праблему павышэння якасці паспяховасці на здыме. Аналіз вынікаў сесій паказвае, што колькасць выдатнікаў на другім, трэцім курсах у параўнанні з першым памяншаецца, а вось колькасць тых, хто займаецца з тройкамі, наадварот, нават некалькі павялічваецца. Тут неабходна вырашыць дзве асноўныя праблемы: па-першае, нам усім трэба больш працаваць, выкарыстоўваючы розныя сродкі, над выхаваннем у студэнтаў любві да сваёй будучай спецыяльнасці, умення бачыць яе значымасць, перспектыву, выхоўваць патрыётаў сваёй прафесіі. Па-другое, праблему маладога выкладчыка. Малады выкладчык, які прыйшоў на кафедру адразу пасля ВНУ або пасля аспірантуры, як правіла, добры спецыяліст, але не заўсёды — добры выкладчык. Рэктарат, вучэбны аддзел, аддзел аспірантуры дастатковую ўвагу гэтаму не ўдзяляюць. На наш погляд, неабходна па-сапраўднаму наладзіць работу школ маладога выкладчыка. Магчыма, ёсць сэнс і ў нас распаўсюдзіць вопыт вытворчых калектываў — я маю на ўвазе інстытут настаўніцтва. Хацелася б, каб і партыйныя арганізацыі факультэтаў падключыліся да вырашэння гэтых пытанняў.

Студэнцкі актыў лічыць, што на якасць вучобы ўплывае і парушэнне амаль усімі дэканатамі тэрмінаў перасдачы экзаменаў. Такое становішча не садзейнічае выхаванню працавітасці і дысцыплінаванасці. Мы лічым, што экзамены павінны перасдавацца ў дакладна ўстаноўленыя тэрміны, а студэнт, які атрымаў «неуды» ў другую, трэцюю сесіі, павінен выключацца з ВНУ.

Вялізны ўплыў на фарміраванне будучага спецыяліста аказвае калектыў акадэмічнай групы. На жаль, у выніку апытання толькі 7,1 працэнта указалі на гэты важны фактар. Гэта гаворыць аб тым, што студэнцкі актыў, куратары акадэмічных груп яшчэ недастаткова клапоцяцца аб стварэнні ў групах дзелавой, творчай атмасферы. Не іграюць у многіх выпадках актыўнай ролі ў групе і камуністы — выпускнікі падрыхтоўчага аддзялення. Іншымі словамі, такі важны рычаг выхавання спецыяліста, як калектыў групы, у нас пакуль бяздзейнічае.

Партком сур'ёзную ўвагу ўдзяляў кіраўніцтву сацыялістычным спаборніцтвам у нашым калектыве. Разам з тым назапашаны вопыт гаворыць аб неабходнасці перагледзець некаторыя пазіцыі ў палажэнні аб спаборніцтве. Не зусім правільна, напрыклад, ацэньваць узровень развіцця масавай самадзейнасці на факультэтах толькі па выніках нашага штогадовага агляду-конкурсу. Такое становішча прыводзіць да таго, што на асобных факультэтах за тыдзень-другі да агляду вучэбны працэс наогул спыняецца, а ўжо праз тыдзень пасля агляду з вялікай цяжкасцю можна адшукаць калектыў, які б змог выступіць у падшэфным калгасе. Гэта ж датычыцца наглядпай агітацыі, насценнага друку.

У апошнія гады ўсё большую ўвагу ў ВНУ надаюць працоўнаму выхаванню студэнцтва. Па выніках трэцяга працоўнага семестра 1978 года універсітэт зноў выйшаў на перадавыя пазіцыі сярод ВНУ рэспублікі.

Разам з тым працоўнае выхаванне — гэта не толькі студэнцкія атрады. Студэнты могуць і павінны прыняць актыўны ўдзел ва ўнутрыуніверсітэцкім капітальным будаўніцтве, рамонце вучэбных карпусоў і інтэрнатаў. Мэтазгодна на студэнцкае самакіраванне перавесці інтэрнаты (уключаючы пасады камендантаў, вахцёраў, уборшчыц і г. д.).

З рэктаратам у нас ужо дасягнута дагаворанасць для пачатку узяць адзін з нашых інтэрнатаў. Тое ж часткова можна зрабіць і па вучэбных карпусах.

У нас сфарміраваўся моцны шматтысячны студэнцкі актыў. Хочацца, каб партыйная канферэнцыя яшчэ раз паставіла перад партыйнымі органамі пытанне аб павелічэнні прыёму нашых лепшых студэнтаў у партыю.

## Р. П. ПЛАТОНАЎ,
**сакратар Мінскага абкома партыі.**

УНІВЕРСІТЭТ з'яўляецца не толькі старэйшай, але і буйнейшай навучальнай установай рэспублікі. Яго выпускнікоў можна сустрэць у розных кутках нашай краіны. Вялікую ролю адыгрывае БДУ ў духоўным жыцці рэспублікі. Партыйная арганізацыя БДУ адна з буйнейшых арганізацый ВНУ. У адпаведнасці з рашэннямі XXV з'езда КПСС ва універсітэце прыняты меры па паляпшэнню якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. Але нельга не заўважаць і тых недахопаў, якія яшчэ ёсць у рабоце універсітэта. На XXVIII з'ездзе КПБ у адрас БДУ былі выказаны крытычныя заўвагі. Але, на жаль, справы паляпшаюцца вельмі марудна. З боку парткома і рэктарата дапускаюцца пралікі ў рабоце. Новаму саставу парткома неабходна сканцэнтраваць усе намаганні на выкананні рашэнняў XXVIII з'езда КПБ.

Выпускнік універсітэта — гэта не толькі чалавек, які ў дасканаласці авалодаў фундаментальнымі навукамі, але і перакананы барацьбіт за камуністычную будучыню. Таму вельмі важны комплексны падыход да навучання студэнтаў. Парткому і рэктарату неабходна яшчэ больш працаваць над узняццем тэарэтычнай і ідэйна-палітычнай выхаваўчай работы сярод студэнтаў.

Перад універсітэтам стаіць шэраг важных праблем, якія патрабуюць тэрміновага вырашэння. Хочацца быць упэўненым, што калектыў універсітэта паспяхова справіцца з гэтым.

## А. А. ВОЛК,
**дэкан філалагічнага факультэта.**

У СПРАВАЗДАЧНЫМ дакладзе добра асвятлялася шматгранная дзейнасць універсітэта. Але, на мой погляд, падыход да ацэнкі нашай работы павінен быць яшчэ больш крытычным.

Філалагічны факультэт — адзін са старэйшых факультэтаў нашага універсітэта. Прыйшоў час падумаць аб стварэнні навуковых падраздзяленняў на нашым факультэце. Гэта неабходна для таго, каб не страціць бясцэнныя помнікі беларускага народа.

Ёсць у нас і іншыя праблемы, напрыклад, слабая падрыхтоўка па рускай мове абітурыентаў. Праграма па рускай мове ў сярэдняй школе зведзена да мінімуму. Неабходна паставіць пытанне перад Міністэрствам асветы аб узмацненні вывучэння рускай мовы ў школе.

Неаднаразова ўжо гаварылася аб тым, што вучэбныя планы разлічаны на дзесяць месяцаў, а фактычна мы працуем дзевяць, а то і менш. У выніку мы вымушаны павялічваць нагрузку студэнтаў да васьмі—дзесяці гадзін. Мы ніяк не можам адарвацца ад традыцыйных форм навучання. Трэба яшчэ раз задумацца, як іх змяніць.

Цяпер, каб прачытаць усю рэкамендаваную літаратуру, студэнту неабходна патраціць часу намнога больш, чым у яго ёсць.

Калі гаварыць аб матэрыяльна-тэхнічнай базе, то наш факультэт знаходзіцца амаль у самым цяжкім становішчы. Мы займаемся ў тры змены, часам нам няма дзе правесці камсамольскі сход ці якое-небудзь іншае мерапрыемства.

Востра паўстала пытанне і аб падрыхтоўцы высокакваліфікаваных выкладчыкаў - філолагаў. Да гэтага часу няма савета па абароне дысертацый.

## В. С. ГРЫГОР'ЕЎ,
**дырэктар выдавецтва БДУ.**

ЗА ТРЫ апошнія гады наша выдавецтва выпусціла каля трохсот кніг агульным тыражом звыш 2,5 млн. экземпляраў. Выдавецтва працуе рэнтабельна. Толькі ў 1977 годзе ў дзяржбюджэт пералічана 251 тыс. рублёў. Лепшыя нашы кнігі вядомы далёка за межамі нашай рэспублікі. Толькі за дзевяць месяцаў гэтага года экспартныя арганізацыі СССР адправілі за мяжу звыш 56 тыс. экземпляраў нашых кніг і атрымалі ад іх продажу 123 тыс. рублёў.

Выдавецтва БДУ прыняло актыўны ўдзел у першай Маскоўскай міжнароднай выстаўцы-кірмашы 1977 года і зараз старанна рыхтуецца да другой, якая адбудзецца восенню 1979 года. Да гэтага часу мы выпусцім 18 манаграфій, якія прапануем для перакладу ў замежных сацыялістычных і капіталістычных краінах.

У сувязі з рэалізацыяй пастановы дырэктыўных органаў у 1977 годзе значна пашырана рэдакцыя часопіса «Веснік БДУ». Аднак неабходна падумаць аб павелічэнні яго аб'ёму і перыядычнасці, таму што зараз навуковыя артыкулы чакаюць публікацыі прыблізна па два гады. Старэюць, губляюць навізну, не даюць той аддачы, якой ад іх чакаюць.

Цяпер выдавецтва працуе над складаннем плана выпуску літаратуры 1980 года. Мы намячаем выпусціць восемдзесят дзве назвы кніг і часопісаў агульным аб'ёмам 900 учотна-выдавецкіх аркушаў. У план неабходна ўключаць ужо апрабаваныя рукапісы, але мы, на жаль, маем такіх толькі 20 працэнтаў. Рубрыка «Гісторыя КПСС» прадстаўлена пакуль што адной работай. Менш цікавая, чым у мінулыя гады, тэматыка работ па філасофіі і навуковаму камунізму. Не першы год мы гаворым аб недахопе ў нашых планах работ па палітэканоміі, актуальных праблемах развіцця прамысловасці, сельскай гаспадаркі і інш. Пакуль што не рукапісамі, адзінкавымі заявамі прадстаўлены ў нашых планах раздзелы «Матэматыка», «Фізіка», «Хімія». Калі тэрмінова не прыняць эфектыўных мер, такое ж становішча будзе і з планам 1981 года. Ужо зараз неабходна падумаць аб падрыхтоўцы да 60-годдзя СССР (снежань 1982 года). Мы зрабілі свае прапановы, але пакуль што не атрымалі ніводнага адказу.

Неабходна сур'ёзна падумаць і аб стварэнні ва універсітэце паліграфічнай базы. Настаў час вырашыць праблему транспарту і складскіх памяшканняў.

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.